Прырода і мы

ТРЫ ЧВЭРЦІ НАШЫХ ВАДАЁМАЎ МАЮЦЬ ЭКАЛАГІЧНЫ СТАТУС «ДОБРЫ» І ВЫШЭЙ

Гэтая інфармацыя была агучана на калегіі Мінпрыроды, на якой падвялі вынікі работы і намецілі планы на будучыню.

Кіраўнік прыродаахоўнага ведамства Андрэй ХУДЫК адзначыў, што практычна па ўсіх кірунках дзейнасці ёсць вынікі, дынаміка і дасягненні не толькі на краінавым, але і на сусветным узроўні. «Так, у сусветным рэйтынгу па індэксе экалагічнай эфектыўнасці Беларусь займае 49 пазіцыю са 180 краін, апярэджваючы ўсе астатнія краіны ЕАЭС. Краіна займае лідзіруючыя пазіцыі сярод краін рэгіёна па якасці паветра, сістэмы кіравання цвёрдымі адходамі, ацэнцы біяразнастайнасці і наваколь нага асяроддзя», — канкрэтызаваў міністр.

Дасягненні Мінпрыроды за апошні час былі праілюстраваны некаторымі лічбамі. Напрыклад, штогод зніжаецца ўзровень выкідаў забруджвальных рэчываў у атмасферу, з 2015 года зніжэнне склала 4,5 %. «Добры» і больш высокі экалагічны статус маюць 74,6 % нашых вадаёмаў. Забяспечаны прырост запасаў нафты па катэгорыі С2 + D0 ў аб'ёме больш за 4 мільёны тон або звыш 138 % ад задання і нафты катэгорый С1 + С2 у аб'ёме 5,75 млн тон або 113 % ад задання на 2018—2020 гады. Плошча асабліва ахоўных прыродных тэрыторый да 2020 года дасягнула 9 % ад плошчы краіны. За апошнія тры гады за кошт сродкаў міжнароднай тэхнічнай дапамогі выкананы работы

па паўторным забалочванні тарфянікаў на плошчы больш за 15 тысяч га.

Актыўна абмяркоўвалася на калегіі пытанне аб шкодных выкідах ад кацельняў. Як растлумачыў **першы намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Баляслаў ПІРШТУК,** праблема існуе. Старыя кацельні пасля мадэрнізацыі могуць працаваць у нармальным рэжыме і паступова колькасць праблемных аб'ектаў змяншаецца. Мадэрнізацыя не патрабуе вялікіх фінансавых выдаткаў, аднак для некаторых балансатрымальнікаў кацельняў і такія сумы непад'ёмныя.

Набірае папулярнасць выкарыстанне мясцовых відаў паліва, у прыватнасці, шчэпак. І сёння існуюць бяспечныя тэхналогіі, але ўсё зноў упіраецца ў фінансы: такое абсталяванне нятанна каштуе. Але ўлічваючы, што расходны матэрыял значна таннейшы, чым газ, выдаткі акупяцца.

Намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Аляксандр КОРБУТ падняў праблему выжывальнасці дрэў, высаджаных на ўзбочынах дарог. Таксама звярнуў увагу прадстаўнікоў органаў мясцовай улады на неабходнасць эфектыўнага выкарыстання зямель, на якіх знішчаны баршчэўнік Сасноўскага: калі адразу не ўвесці іх у гаспадарчы абарот, праз год-два там зноў вырасце агрэсар.

Намеснік прэм'ер-міністра Аляксандр СУБОЦІН, які прысутнічаў на калегіі, заўважыў: «Зялёны» парадак дня ў свеце становіцца ўсё больш і больш актуальны. Ён пачынае ўплываць на развіццё іншых галін, на развіццё эканомікі, прамысловасць змяняецца з-за «зялёнага» руху, некаторыя галіны знікаюць. Таму ваша роль у эканоміцы і ў дзяржаве павінна расці. Хацелася б, каб ваша здольнасць атрымліваць замежныя гранты, тэхнічную дапамогу значна павялічылася. Задача складаная, але бачачы, як гэта робяць Грузія, Казахстан, думаю, што і ў нас рэзервы ёсць».

На бягучы год агульны бюджэт праектаў, якія рэалізуюцца з міжнароднай тэхнічнай дапамогі, запланаваны ў памеры 31 млн долараў і 11,8 млн еўра. Выдаткі праектаў за 2020 год склалі 7,5 млн долараў і 3,9 млн еўра.

Аксана ЯНОЎСКАЯ.
Фота прэс-службы Мінпрыроды.

Зялёнае багацце

ГОД ЛЯСНЫХ КУЛЬТУР

Ён павінен стаць пераломным у стаўленні да гэтага пытання

Адна з тэндэнцый апошніх гадоў у галіне лясной гаспадаркі — нарошчванне аб'ёмаў вытворчасці пасадачнага матэрыялу з закрытай каранёвай сістэмай, расказаў кіраўнік ведамства Віталь ДРОЖЖА.

— З гэтай нагоды ў 2018—2020 гадах былі пабудаваны чатыры новыя спецыялізаваныя цяплічныя комплексы. У выніку ў 2020-м такім спосабам вырашчана 21,4 мільёна раслін. Да 2025 года гэты паказчык плануецца павялічыць да 25 мільёнаў. Разам з тым, у нас узніклі пэўныя праблемы. Летась было спісана больш за пяць тысяч гектараў лясных культур. З прычыны стыхійных бедстваў, засухі, пажараў, граду — 1719 гектараў, 992 гектары — з-за несвоечасовага догляду. Прызнаючы складанасці ў галіне ўзнаўлення лясоў, сёлетні год мы аб'явілі Годам лясных культур. Ён павінен стаць, па сутнасці, пераломным у нашым стаўленні да гэтага пытання. Для вырашэння задач у нас ёсць усё неабходнае: створана матэрыяльная база, ёсць пасадачны матэрыял адпаведнай якасці.

У адпаведнасці з даручэннем Прэзідэнта, у 2020 годзе забяспечаны ўвод у эксплуатацыю сямі сучасных высокатэхналагічных вытворчасцяў па выпуску паліўных гранул у Барысаўскім, Мазырскім, Капыльскім доследных, Навагрудскім, Пружанскім, Клічаўскім, Жыткавіцкім лясгасах з аб'ёмам інвестыцый больш за 80 мільёнаў рублёў. «На ўвесь аб'ём выпускаемай пелетнай прадукцыі заключаны кантракты, заводы выйшлі на прыбытковую работу, — адзначыў міністр.

— Наша першачарговая задача — забеспячэнне сыравінай айчыннага перапрацоўшчыка. У нас функцыянуе 96 дрэваапрацоўчых вытворчасцяў. За мінулы год арганізацыямі Мінлясгаса нарыхтавана больш за 21 мільён кубаметраў драўніны, у тым ліку іншымі арганізацыямі шляхам аказання паслуг — 6,7 мільёна кубаметраў. Захаванне дрэваапрацоўчых цэхаў дазваляе нам забяспечыць занятасць і гарантаваны заробак больш чым 4,5 тысячы чалавек, якія пражываюць у малых гарадах і сельскай мясцовасці, — паведаміў Віталь Дрожжа.

Дар'я ШЛАПАКОВА.

ПАКУЛЬ НЕ РАЗЛІЛІСЯ РЭКІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Для таго каб адпрацаваць механізм дзеянняў падчас «вялікай вады», у Пухавіцкім раёне прайшлі спецыялізаваныя абласныя вучэнні. Удзельнічалі ў іх прадстаўнікі многіх ведамстваў. Сярод іх — міністэрствы па надзвычайных сітуацыях, унутраных спраў, дарожныя службы...

— На тэрыторыі Мінскай вобласці ёсць традыцыйна напружаныя мясціны з пункту гледжання паводкавай абстаноўкі, — расказвае **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Анастасія ШВАЙБОВІЧ.** — Гэта традыцыйна ўчасткі Стаўбцоўскага, Барысаўскага, Маладзечанскага, Пухавіцкага раёнаў. Яны знаходзяцца ў поймах Бярэзіны, Плісы, Бабра, Ушы, Нявежы, Віліі, Свіслачы і Нёмана.

Менавіта пойма Свіслачы і стала своеасаблівай трэніровачнай пляцоўкай. Першым пунктам, куды высадзіліся ўдзельнікі вучэнняў, стаў мост праз Свіслач у раёне вёскі Лешніца. Паводле легенды, яго апоры былі пашкоджаны крыгаходам. Праз гэта ўзнікла небяспека таго, што ён можа абрынуцца. Задача складалася ў тым, каб забяспечыць бяспеку мясцовых жыхароў і арганізаваць аб'езд транспарту.

Але перш чым пачынаць экстранны рамонт апоры,

транспарту трэба падабрацца да поймы ракі. Для гэтага будучая дарога чысціцца ад снегу і заадно падсыпаецца пяском з самазвалаў. Дарожнікі тым часам рыхтуюць спецыяльныя металічныя канструкцыі. Яны будуць трымаць апоры да таго часу, пакуль хібы не ліквідуюць. Спецыялісты запэўніваюць, што пры неабходнасці могуць сцягнуць спецыялізаваную тэхніку з розных куткоў Мінскай вобласці. Дабярэцца яна сюды за лічаныя гадзіны.

Пры падобных надзвычайных сітуацыях склікаецца спецыяльная камісія, у якую ўваходзяць прадстаўнікі многіх службаў. Узначаліў яе **намеснік старшыні Пухавіцкага райвыканкама Аляксандр СУГАК.**

— У нашым раёне ў зоне магчымага падтаўлівання знаходзіцца каля дваццаці вёсак. Мы гатовыя вывезці іх жыхароў на транспарце мясцовага аўтапарка, — сцвярджае суразмоўнік. — Шмат рэйсаў для гэтага не спатрэбіцца. Напрыклад, тут, у вёсках Лешніца і Ванькаўшчына, усяго жыве каля сотні чалавек. Але я не магу згадаць выпадкаў, калі б даводзілась эвакуіраваць людзей у рэальнасці. Ды і апошняя паводка адбылася ў нас даволі даўно — каля пяці гадоў таму. А пасля снег ці то зусім не выпадаў, ці то яго было вельмі мала. Вось што сапраўды ўяўляе патэнцыяльную цяжкасць падчас эвакуацыі, дык гэта садовыя таварыствы. Іх у нас у раёне каля 170. Прычым частка людзей жыве там і ўзімку.

Праз некаторы час эпіцэнтр вучэнняў перамяшчаецца на новы пункт. Уздоўж Свіслачы ідзе невялікая вясковая вулачка. Па легендзе, яе ўчастак быў размыты моцнымі дажджамі. Яны, у сваю чаргу, справакавалі падняцце вады ў рацэ да крытычнага ўзроўню. Жыхары наваколь ных дамоў сталі паведамляць аб тым, што вада пачала пранікаць на іх прысядзібныя ўчасткі. Задача аварыйных службаў — адвесці ваду і вярнуць дарогу ў спраўны стан. Для гэтага трэба арганізаваць работу грэйдара і падсыпку грунту.

— Мы зыходзім з таго, што размыла каля 120 метраў дарогі. Побач знаходзіцца кар'ер, адкуль можна вазіць пясок, — паясняе **галоўны інжынер ДРБУ-169 філіяла КУП «Мінскаблдарбуд» Юрый РАЗМЫСЛОВІЧ.** — Але падабрацца сюды мы можам толькі заднім ходам. Наогул трэба падсыпаць каля тысячы кубаметраў грунту. Па часе мы адводзім на гэта каля шасці гадзін. Работы па дасыпцы вядуцца з паслойным зацвярдзеннем. Гэта значыць, што з будаўнічых сумесяў робіцца спецыяльнае пакрыццё.

Падтопленыя землі маюць патрэбу і ў санітарным кантролі.

— Мы праводзім падворныя абходы для таго, каб выявіць магчымыя падтопліванні, асабліва падвалаў, сховішчаў гною, кампоставых ям, — расказвае **ўрач-гігіеніст аддзела гігіены Пухавіцкага раённага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Юрый ВАРДАМСКІ.** — Таксама адбіраем пробы з шахтных калодзежаў. Калі вынікі даследаванняў не адпавядаюць санітарным нормам і правілам, будзем праводзіць дэзінфекцыю пры дапамозе таблетак. Жыхарам жа рэкамендуем ваду кіпяціць або ўвогуле карыстацца той, што прадаецца ў бутлях.

Фінальны пункт вучэнняў — адначасова і самы складаны. Меркавалася, што быў пашкоджаны газаправод на падводным участку і была парушана лінія сувязі. Вадалазам трэба было правесці адпаведныя рамонтныя работы ў адчувальны холад — тэмпература за бортам апускалася далёка за нуль.

— Адпрацоўваем сітуацыю, калі без газу засталіся адразу два раёны — Пухавіцкі і Чэрвеньскі, — тлумачыць **галоўны інжынер Пухавіцкага раёна газаснабжэння Святлана ЕРМАЛІНСКАЯ.** — Сярод спажыўцоў — 16 прамысловых прадпрыемстваў, 20 камунальна-бытавых і больш за сем тысяч абанентаў. Іх нельга пакідаць без «блакітнага паліва». Пэўная частка іх — з катламі. Час перападключэння — ад 30 да 50 хвілін. Запасаў газу ў газаправодзе дастаткова, каб забяспечваць насельніцтва на працягу некалькіх гадзін. Аднак для гэтага трэба адключыць вытворчыя аб'екты.

На практыцы такія сітуацыі могуць узнікнуць праз простую чалавечую неахайнасць. Скажам, нейкая арганізацыя пачала раскопку на тэрыторыі, а перад тым у газазабяспечвальную арганізацыю не звярнулася. Як вынік — экскаватар чапляе газавую трубу.

Падобныя вучэнні будуць праводзіцца рэгулярна.

— Мы даём ацэнку рабоце розных ведамстваў. Гэта неабходна для таго, каб ацаніць стан, здольнасць прыняць імі тыя ці іншыя кіраўнічыя рашэнні ў выпадку ўзнікнення падобных сітуацый, — адзначыў **першы намеснік начальніка Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Уладзімір ЯНЧЫК.**

Валяр'ян ШКЛЕННІК.
Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.